Opłata pocztowa uiszczona ryczałtem.

БЕЛАРУСКІ ЗВОН

Радыкальная часапісь, выходзіць 4 разы ў месяц

Цана асобнага нумару 15 гр.

Адрэс Рэдакцыі і Адміністрацыі
Вільня, Мэтрапалітальны пл. 3/12.

Прыймо інтэрэсантаў ад 10 да 2 г. што-дня, апрача сьвятаў і нядзель.

ПАДПІСКА з дастаўкай да хаты: на 1 год 4 зл. 50, за паўгоду 2 зл. 40, за 3 месяцы 1 зл. 30, за 1 месяц — 50 гр.

Год II. Вільня, 29 кастрычніка 1932 г. № 30 (60)

„Панская паска“,

або дар „буйных рольнікаў“ — „дробным рольнікам“.

Шмат каму памятны йшчэ той закон аб арганізацыі самаўрадаў, якім у даваенныя часы пануючыя тады партыі маніліся надзяліць Польшчу. Праект гэтага закону, апрацаваны б. міністрам Кернікам, быў пабудаваны на самым грубым патаптаньні прынцыпу роўнасьці правоў усіх грамадзян у гаспадарстве: пры выбарах у самаўрады прадстаўнікі багацейшых клясаў мелі атрымаць права падаваць па некалькі галасоў, сяляне — па адным. І беларуская радыкальная прэса, бачучы ў гэтым імкненьне — у адносінах да беларускіх зямель Польшчы — забясьпечыць панаваньне польскага абшарніцтва над беларускім сялянствам, вельмі востра крытыкавала гэны законапраект, пратэстуючы проці правядзеньня яго ў жыцьцё.

Цяпер, пасьля колькігадовага перарыву, справа выданьня новага самаўрадавага закону стаіць на парадку дня. І абшарнікі, якім Кернікавы законапраект даваў поўнае панаваньне ў самаўрадах, робяць усе высілкі, каб і цяперашні самаўрадавы законапраект пабудаваць на прынцыпе грамадзкае няроўнасьці — на прынцыпе аддачы самаўрадавае гаспадаркі ў рукі „буйных рольнікаў“, пазбавіўшы голасу і ўплыву на гэную гаспадарку многамільённыя масы сялянства—„дробных рольнікаў“.

Толькі-што абшарніцкая прэса падала да ведама абшарніцкі праект самаўрадавага закону, апрацаваны адумысловай камісіяй пад рэдакцыяй п. С. Ваньковіча. Не ўваходзячы ў разгляд праекту падрабязна, затрымаемся на адным пункце яго, каторы якраз і імкнецца даць у самаўрадах такую-ж перавагу над сялянствам паном-абшарнікам, як гэта рабіў і Кернікавы законапраект. Вось гэты пункт (цытуем паводле „Слова“ № 260 з 17.X.1932 г.):

„Гмінная рада выбіраецца гмінным сходам. Удзельнікамі гміннага сходу ёсьць а) уласьнікі 50 гэктараў зямлі ці мескае нярухомасьці роўнае вартасьці, а такжа афіцэры рэзэрвы, якія жывуць у гміне, незалежна ад іх маемасьці; б) дэлегаты ад уласьнікаў меншае маемасьці, аб'яднаных у камплекты па 100 гэктараў, якія даюць 1 голас“.

Прасьцей кажучы: *поўнапраўнымі сябрамі гмінных сходаў* паны-абшарнікі хацелі-б бачыць толькі тых „браці рольнікув“, якія маюць *50 ці больш гэктараў зямлі*. Такіх, як ведама, ёсьць у нас зусім малая лічба, раўнуючы да *мільёнаў малазямельных сялян*, каторых абшарніцкі законапраект імкнецца *зусім адсунуць ад беспасярэдняга ўчасьця ў гмінных выбарах*. Праўда, ім хочуць даць права злучацца ў групы, якія супольна мелі бы 100 гк. і пасылаць на гмінны сход выбарных дэлегатаў — па адным ад 100 гк. Але і тут ізноў бачым крычачую няроўнасьць. — Мала таго, што *адзін голас прыпадаў-бы на 50 малазямельных сялян*, маючых у сярэднім ліку на 2 дзес: аказваецца, аўтары абшарніцкага праекту хочуць надзяліць *50 гэктараў панскае зямлі такім-жа правам, як 100 гк. сялянскае*.

Гэта ўжо яўны зьдзек. І мы, падаючы наш голас пратэсту проці спробы абшарнікаў *узаконіць няроўнасьць грамадзкіх правоў „буйных рольнікаў“ і „дробных рольнікаў“, або прасьцей—паноў і сялян*, выказваем сваю глыбокую веру, што дзяржаўны розум кіраўнікоў польскага гаспадарства ня пойдзе па шляху, на які заклікае яго, як мы ўжо ня раз казалі, збанкрутаваная і гаспадарча, і маральна, і палітычна кляса абшарнікаў. Толькі людзі, утраціўшыя ўсякае пачуцьцё рэальнасьці, могуць лятуцець аб увядзеньні ў нашых часох сыстэмы, на падобную да якое адважылася некалі царская Расея ў часох Сталыніна. Развал расейскага царызму даў найлепшы доказ, што на такіх падставах нельга будаваць грамадзкае жыцьцё. Павароту да сталынішчыны быць ужо ня можа.

1.500.000.

Беспасярэдна пасьля правядзеньня агульнага сьпісу насяленьня ў Польшчы мы зьмясьцілі цэлы рад карэспандэнцыяў з усіх канцоў Заходняе Беларусі — аб тым, якімі спосабамі іншыя з перапішчыкаў стараліся штучна зьменшыць запраўдную лічбу беларусаў. І гэтымі „штукамі“ яны свайго дапялі: як мы ўжо паведамлялі нашых чытачоў, у межах Віленскага ваяводзтва сьпіс паказаў 60% насяленьня з польскай матчынай мовай, у Навагрудзкім—52,6%, а ў Беластоцкім—дык ажно 72%.

Мэта тварэньня, хоць толькі на паперы, польскае большасьці ў Зах. Беларусі—зусім ясная: раз тут пануе польская мова, як матчыная мова такое вялізарнае большасьці жыхараў краю, дык і край гэты — чыста польскі, і аб ніякай Беларусі ня можа быць гутаркі... Так разважалі пэўна-ж тыя, хто прылажыў сваю руку да пapсаваньня тэй вялізарнай працы, якая была зроблена пры сьпісаваньні насяленьня. Палітычная мэта аказалася дасягнена; навуковая—не.

Толькі цяпер у прэсе пачынаюць зьяўляцца патроху даныя перапісі аб лічбе людзей, якія, не гледзячы на ўсе „штукі“ перапішчыкаў, цьвёрда стаялі на тым, што яны —беларусы, і прымусілі гэткімі сябе запісаваць. Ясна, што трэба было многа грамадзкае адвагі, цьвёрдасьці і—галоўнае—сьвядомасьці, каб дабіцца свайго. І такіх цьвёрдых і сьвядомых беларусаў знайшлося паўтара мільёна.

Цыфра гэтая—бясспрэчна не адпавядае запраўднасьці. Беларусаў над Польшчай шмат больш—каля 2½ мільёнаў, і, значыць, ня менш як мільён беларусаў аказаўся запісаным няправільна.

Жыцьцё Польшчы.

Плян зьмены польскае канстытуцыі.

Толькі-што адзін правадыр „Беспартыйнага Блёку“, былы міністар справядлівасьці Цар, заявіў, што канстытуцыя ў Польшчы павінна быць зьменена, і гэтым мае ў першую чаргу заняцца наступная чарговая сэсія Сойму. Галоўныя зьмены ў канстытуцыі маюць быць наступныя:

Прэзыдэнт Рэспублікі мае выбірацца ня Соймам і Сэнатам на злучаным іх паседжаньні (Нацыянальным Сабраньні), як цяпер, але — на асобных выбарах — усенародным галасаваньнем. Выбіраць будуць спаміж трох кандыдатаў. Двух кандыдатаў прадстаўляе Нацыянальнае Сабраньне, а трэцім зьяўляецца стары прэзыдэнт, ці, калі ён сам ня хоча кандыдаваць, прадстаўлены ім кандыдат.

Другая зьмена мае датычыць права Сойму выражаць недавер ураду: права гэтае мае быць абмежана яшчэ далей, каб забясьпечыць выканаўчай уладзе яшчэ большую сталасьць.

Далей мае быць цалком зрэфармаваны спосаб выбараў у Сэнат. Шляхам выбараў маюць быць укамплектаваны толькі дзьве траціны яго складу; рэшту сяброў мае назначаць прэзыдэнт — з так-зван. „гаспадарчых кругоў“.

Урэшце, мае быць павышаны век грамадзян, маючых права выбіраць і быць выбранымі ў склад законадаўчых палатаў (Сойму і Сэнату).

Дэкрэт аб амністыі.

Польскія газэты апублікавалі дэкрэт п. Прэзыдэнта аб амністыі—у сувязі з увядзеньнем новага карнага кодэксу. Дэкрэт мае звольніць ад дробных кар да 6 месяцаў вастрогу і штрафаў грашмі ды зьменшыць на палову кару вастрогам ад 6 мес. да 1 году. Не падлягаюць дараваньню ці зьмяншэньню кары за праступкі проці войска, дзяржаўнага ладу, дзяржаўнага скарбу, а такжа кары за фальшаваньне грошы ды пасрэдніцтва ў распусьце,

Забастоўка хлебаробаў.

У Клецкім, Люблінскім і Кракаўскім ваяводзтвах пачалася асаблівая забастоўка хлебаробаў: яны спынілі падвоз прадуктаў да местаў, дзе ім плацяць цяпер гэтак мала. Забастоўкай кіруюць „людоўцы“, сярод якіх паліцыя зрабіла шмат арыштаў.

Як перасылаць грошы за газэту.

Гэтым паведамляем нашых падпішчыкаў, што яны могуць перасылаць належныя нам грошы за газэту гэтакім спосабам: 1) купіць на пошце блянк для пераказу на рахунак П. К. О., які каштуе толькі 5 гр., 2) запоўніць яго, як належа, упісаўшы адрас беларускае кнігарні Ул. Манкевіча (Księgarnia Białoruska Wł. Mankiewicza, Wilno, Ostrobramska I) і нумар конта 61991, 3) на адвароце часткі блянку „dla adresata“ напісаць: „За газэту“— і 4) бясплатна здаць разам з блянкам пасыланую суму на пошце.

24021

З жыцьця ў Б. С. С. Р.

Савецкая Беларусь не дае грошы.

„Сав. Беларусь“ з дн. 19. X. 32 г. падае, што калегія Народнага Камісарыяту Фінансаў СССР пастанавіла забраць пераходны чырвоны сьцяг (свайго роду нагароду) ад БССР—з прычыны якасьці нездавальняючага выкананьня ёю пляну мабілізацыі сродкаў і пляну падаткаў з абароту у III квартале.

„Талачынскі нарсуд ня можа судзіць“.

Пад такім загалоўкам падае „Сав. Беларусь“ з 19. X. 32 г. заметку, якую нельга не паўтарыць за ёй уцэласьці. „20 верасьня г. г. праўленьне калгасу „Молат“ Славенскага сельсавету, Талачынскага раёну, знайшло ў грамадзянкі Казловай М. салому, якая была пакрадзена ў калгасе. Калі была зложана скарга ў Талачынскі Нарсуд, каб Казлову прыцягнулі да адказнасьці, дык судзьдзя сказаў: „Судзіць я не магу, за крадзеж калгаснай маемасьці трэба расстраляць, а за 10 пудоў саломы я расстрэльваць ня буду“. Пасьля гэтага ў калгасе сталі вельмі частымі выпадкі пакражы саломы, колаў. Ніхто ніякіх захадаў не ўжывае“. У далейшым рэдакцыя выказвае сваю надзею на інтэрвэнцыю пракурора раёну, які хіба адазьвецца, а нарсудзьдзя будзе ўжо расстрэльваць і за адзін пуд саломы...

БССР па маслазагатоўкам—у хвасьце.

„Сав. Беларусь“ з 19. X. 32 г. падае: „Па выкананьню цэнтралізаванага пляну маслазагатовак БССР пляцецца ў хвасьце, выканаўшы плян на 10. X. 32 году толькі на 43,5 проц.—у той час, калі рад рэспублік, краёў і вобласьцяў падыходзіць да выкананьня гадавога цэнтралізаванага пляну“. „Разбазарываньне малочнай прадукцыі зьяўляецца адной з асноўных прычын невыкананьня цэнтралізаванага пляну загатовак“.

Відаць, штось бунтуецца селянін у саветах: грошы не дае, масла не дае, хлеба не дае, а можа хутчэй усяго яя мае ўжо чаго даць, апроч уласнае скуры і касьцей?

„Дом вучоных“ у Менску.

Як падае „Сав. Беларусь“ з дн. 22. X. 32 г., гэтымі днямі ў Менску пачаў працаваць „Дом вучоных“, як зачынены клюб для высока кваліфікаваных навуковых працаўнікоў. Гэты „Дом“ павінен садзейнічаць навуковай рабоце і лепшаму адпачынку вучоных. Цікава, што ўжо больш 200 чалавек запоўнілі анкеты аб паступленьні ў сябры „Дому вучоных“.

Падручнікі для школ.

„Савецкая Беларусь“ з дня 22. X. 32 г. дае вялікі артыкул, у якім піша: „Ужо больш як паўтара месяца ў школах ідуць заняткі амаль... без падручнікаў“. Пры бліжэйшым зазнаямленьні з гэтай справай аказваецца, што Дзяржаўнае Выдавецтва Беларусі на 23 праектаваныя падручнікі I канцэнтру выдала толькі 12, а для II канцэнтру на 30 праектаваных і бязумоўна патрэбных—толькі 5. Гэтыя цыфры і трывога, якую забіла „Сав. Беларусь“, паказваюць, як шыбка разрастаюцца беларускія школы ў БССР і як многа трэба ім падручнікаў.

З украінскага жыцьця.

Тры прэтэндэнты на валаданьне Украінай.

Як ведама, ў Бэрліне жыве стала былы „гэтман Украіны“ ген. Скоропадскі, які спадзяецца, што немцы ў хуткім часе ізноў пасадзяць яго на „ўкраінскі трон“ з гэтманскай булавой у руках, ня гледзячы на правы народнага ўраду, які жыве ў Парыжу. Але ў апошнія часы зьявіліся адразу аж два новыя яго канкурэнты. Першы — нейкі Макогон з Амэрыкі, які выдае сябе за патомка „гэтмана“ Разумоўскага, якому гэты пусты тытул быў дадзены Кацярынай II за ведамыя яго „таленты“. Другі — нейкі Полтавец-Остраніца, які жыве ў Мюнхене (ў Бавары) і зьнюхаўся з Гітлерам, ад якога спадзяецца гэтманскай булавы. Усе тры „гэтманы“ з нецярплівасьцю чакаюць адбудовы манархіі ў Нямеччыне; тады мае распачацца „настаяшчае жыцьцё“, і „гісторыя вернецца ў сваю заправўдную каляіну“, як піша адна з лістовак Гітлера.

З жыдоўскага жыцьця.

„Самастойная Жыдоўская Рэспубліка“ ў складзе СССР.

Спадзяючыся здабыць вялікія грошы ад міжнароднага жыдоўскага капіталу, бальшавікі пачалі рабіць шмат жыдоўскіх земляробскіх калёніяў у Беларусі, на Украіне, а найбольш на ўзьбярэжжы Чорнага мора дый на Крыме. У апошні час бальшавікі стварылі новую „самастойную рэспубліку“: Жыдоўскую—на Далёкім Усходзе. Вялізарны Біробіджанскі вокруг абшарам у 38.000 квадр. кілям., які ляжыць у 1000 кілям. на захад ад Уладзівастоку, аддадзены „ў дар жыдоўскаму народу“.

Вокруг гэты з надзвычайна ўрадлівай зямлёй, мае ўсялякія натуральныя багацьці. Бальшавікі маюцца пасяліць у новай рэспубліцы ў хуткім часе 50 тыс. жыдоў, дзеля чаго маюць зьвярнуцца аб дапамогу да міжнароднага жыдоўства. Пакуль-што выехала ў новую краіну, якая мае—па думцы Масквы — канкураваць з Палестынай, толькі 6.000 жыдоў.

С. С. С. Р.

Масавыя ахвяры „сталінскага курсу“.

З Масквы паказуюць аб новых масавых арыштах, вобысках, ссылках і казьнях у СССР, навет — сярод найвышэйшых асоб з кіруючых кругоў камуністычнай партыі, а такжа сярод найвыдатнейшых вучоных, прафэсароў, спэцыялістаў, наагул—інтэлігенцыі. Усе сталічныя вастрогі аказаліся зацеснымі для масы новых жыхароў: прышлося адвесьці для новых „гасьцей“ вайсковыя казармы на Хадынцы. Паліцэйскі апарат, шпікі ГПУ працуюць ува ўсю. Сярод арыштаваных—два старыя найвыдатнейшыя бальшавікі: Зіноўеў, былы крывавы дыктатар Петраграду, і Каменеў. Абодва трапілі „на Лубянку“, куды самі садзілі тысячы людзей. Новы пагром уласнай партыі зроблены Сталіным, каб „дабіць даканца“ абедзьве апазыцыі адразу: як левую, такcама і правую. Усіх арыштаваных маюць судзіць за „шкодніцтва“ і „контр-рэвалюцыю“. Сталін адкрыта заявіў, што ўсім ім „трэба адкруціць (отвинтить) галовы“...

Характэрна аднак-жа, што нібы ўжо „разгромленая дарэшты“ правая апазыцыя ня толькі жыве, але яшчэ здабыла сабе большыя ўплывы пасьля сталінскага пагрому. Правая апазыцыя, як ведама, апіраецца на сялянства, з лона якога, асабліва праз чырвоную армію, ідуць па адрасу ўраду зусім выразныя пагрозы... У выніку гэтага навет пасьля „поўнага разгрому“ правай апазыцыі на апошняй сэсіі Ц. К., Сталін змушаны быў запрапанаваць яе правадыром найвыдатнейшыя становішчы ў урадзе. Але ўсе яны, на чале з Сакольнікавым (фінансістам) і Бухарыным, якому запрапанаваны быў камісарыят асьветы, адмовіліся, бо пастаўленыя імі варункі былі адкінены Сталіным.

Г. П. У. быццам раскрыла новую вялізарную змову процi Сталіна. На чале змовы стаяў работнік—„выдвиженец“ Рютін. „Паўстанцы“ мелі захапіць уладу і скінуць Сталіна. Праграма іх зьмяшчалася галоўным чынам у двух пунктах: „Далоў калектывізацыю!“ і „больш волі прыватнаму пачыну наагул у-ва ўсіх галінах гаспадарчага жыцьця!“...

Ваенны бюджэт СССР.

Агульная сума выдаткаў на радавую армію складае 1 мільярд 100 мільёнаў залатых рублёў, сума больш-менш роўная ўсяму дзяржаўнаму бюджэту Расеі ў царскія часы ў пачатку XX стагодзьдзя.

Такога вялізарнага ваеннага бюджэту ня мае ніводная з найбагацейшых дзяржаваў сьвету...

А. Баранскі.

Марціяна.

Жалілася Марціяна Трыбушанка на свайго гаспадара:

— Хваробачка ведае, якога ражна яму не хапае. Дагаджаю, як магу, а ўсё мала. Сягоньня на мяне як насеў: „Каторы раз — кажа — табе прыказываю, каб, падаючы абед, мела чыстыя рукі?“ А рукі былі чыстыя. Мала што яны чорныя. Белымі-ж ні ўтрымаеш, калі трэба то бульбу капаць, а пасьля яе скрабаць, то бацьвіньне палоць. А ён зара робіць крык: „Няма — кажа — культуры!“ Спачатку я думала, што ягоная жонка нябожчыца так называлася. Ажно не. „Культура“ па ягонаму гэта, ну, як сказаць, быццам нейкая панская натура. Паводле яе трэба, каб усё было чыста. Значыцца, не выцірай носа рукавом, ня еж разам з аднае міскі, ня сьпі ў ботах і іншыя недарэчнасьці. Нядаўна — ці дасьцё веры? — купіў мне мой гаспадар бляшаны ўмывальнік. Такое, значыцца, начыньне з зялезным ражном зьнізу. Калі ражон пальцамі пορкнеш угару, — вада цурком ліецца на рукі. Яно можа гэта і добра для людзей далікатных, а нашаму брату, які да такіх штук ня прывык, дык дадушы-ж праціўна. Прыбіў да вушака на сьмех усей вёсцы! Ня верыце — прыдзеце паглядзець. I скуль гаспадар гэтага панскага духу набраўся — наглая яго ведае?! Кажуць, змоладу быў простым рабочым на фабрыцы. Цяпер жыве, як усе мы, і фанабэрыі ня мае. Здаецца, і добры чалавек, а гэтай культурай так мяне замаяў, што і жыць ня хочацца. Калі так пойдзе — прыдзецца кідаць. Згары ён з сваёй чыстатой нялюдзкай!

Суседка Тамашыха з дачкой слухала Марціянінай скаргі і ківаньнем галавой уніз патаківала; ўканцы на разьвітаньне сказала:

— Цярпі, дзіцятка, на другім сьвеце будзе табе лягчэй!

З таго дня Тамашыха не прапускала ані адное аказіі, каб суседзям не пажаліцца на нялюдзкасьць Марціянівавага гаспадара — Янкі Баравога.

Вынік нараканьняў Марціяны быў такі, што на трэці дзень пагаварвалі аб тым, як Баравы катуе сваю служанку:

Баравы гэта кат,—казалі ў вёсцы, — ён так пэўне і сваю жонку нябожчыцу ў магілу загнаў. Жартачкі: праз такую драбязу чалавека біць. Быццам служанка не такую самую мае душу, як гаспадар! Добры чалавек і сабакі біць ня будзе.

Дзьве суседкі навет пасварыліся праз тое, ці Баравы біў Марціяну падпінкай, ці вяровачнымі путамі, змочанымі ў вадзе.

Калі Баравы выяжджаў у поле, вясковыя бабы ўкрадкам прыхадзілі аглядаць, што гэта за прыладу да мукаў купіў гаспадар Марціяне. Адны толькі плячыма паціскалі гледзячы, іншыя-ж без канца сьмяяліся. Умывальнік, як кожная навіна, быў прыняты даволі негасьцінна.

Сядзеў раз Баравы за сталом, чакаючы абеду. Як Марціяна ставіла міску капусты перад гаспадаром, вочы яго скіраваліся на рукі служанкі. На берагох белай эмаліяванай міскі чарнелі плямамі два вялікія пальцы. На хвіліну мігнулі раскрытыя далоні, і на іх Баравы, як звычайна, аглядаў густую сетку ліній чарнільнага колеру на сальнабрудным фоне. Грубая скура Марціяніных рук ад рожнай хатняй і гароднай работы была моцна патрэсканая, а шырокія і глыбокія трэшчыны шчыльна напоўнены чорнай масай.

Служанка ўлёт спасьцерагла кірунак гаспадаровага пагляду і, паварачываючыся да выхаду, скарэй апусьціла рукі.

Баравому ўспомнілася ўсё, што ён толькі чуў аб катаваньнях. Хапіла шалёная злосьць, быццам Марціяна яго нечым за самае сэрца раптоўна закалупіла.

— Ты ізноў рук не памыла?!—крыкнуў.

— Ніяк адмыць не магу; так закарэлі, што ніякае мыла не памагае.

— Табе казана мыць карасінай!

— Не памагае.

Хацела адыйсьці, але Баравы хапіў за локаць і, паказываючы на край міскі, запытаўся гнеўна:

— Ты бачыш, што гэта?

На берагох міскі віднеліся два выразныя сьвежа адбітыя сьляды вялікіх пальцаў. Лініі скуры адбіліся як на адумысловы заказ.

Перачытаўшы газэту — перадай другому.

Плян ратаваньня савецкай валюты.

Залаты запас дзяржаўнага банку СССР зьмяншаецца катастрафічна. Савецкае золата плыве ракой у Нямеччыну... У выніку гэтага валюце СССР пагражае поўная катастрофа. З фінансамі ня можа даць рады нават сам „цудоўны грузін", насьледнік „чароўнай улады" Леніна—Сталін... Успомнілі тады пра сасланага ў свой час за „правую апазыцыю" ў Лёндан на становішча пасла Сакольнікава, тварца савецкага чырвонца. Але Сокольнікаў, прыехаўшы ў Маскву, запрапанаваў такі „плян ратаваньня савецкай валюты", які распрадае на „парцэляцыю" СССР... Па пляну Сакольнікава, які быццам ужо ў Лёндане вядзе перагаворы аб выкананьні яго, трэба зрабіць гэтыя „транзакцыі":

1. прадаць міжнароднаму хаўрусу правы СССР на Манчжурскую чыгунку;

2. прадаць Японіі другую палову Сахаліна;

3. аддаць Амэрыцы ў даўгасрочную арэнду Камчатку;

4. аддаць Польшчы — ў хаўрусе з міжнароднымі капіталістамі — ў карыстаньне Адэскі порт з сеткай зьвязаных з ім чыгункавых шляхоў;

5. аддаць міжнароднаму хаўрусу капіталістаў нафтавыя промыслы і марганцавыя капальні на Каўказе і г. д.

Да гэтага пляну ангельскія фінансісты дадаюць яшчэ сваю прапазыцыю, каб Масква дала ім канцэсію на стварэньне новага Дзяржаўнага Банку ў Маскве, які будзе выпускаць новыя грошы для СССР, але мае быць цалком незалежным ад радавага ўраду.

З усяго сьвету.

Парляманцкія выбары ў Нямеччыне.

Як ведама, 6 лістапада маюць адбыцца агульныя парляманцкія выбары ў Нямеччыне. Характэрна, што ўрад рашыўся на новыя выбары, маючы проці сябе ў апазыцыі блізу ўсе партыі, апроч толькі нацыяналістаў. Зато ён мае ў сваіх руках войска, грошы і паліцыю...

Безрабоцьце ў Нямеччыне.

Агульная лічба безработных дайшла ў Нямеччыне да 5 мільён. 150 тыс. чалавек, павялічыўшыся за апошні тыдзень на новых 50 тысяч.

Паралелі.

Ці бачыў ты жыцьцё?
Ці знаеш добра гэта слова?
Жыцьцё...
Яно, як казка ўсходняй ночы,
Прыбранае ў атласы, аксаміты,
Бясклопатнае так,
Як мілага дзіцяці
Шчабятаньне — мова.
Вясельле, сьмех,
Кабеты і віно—
Яго удзел...

. . . .

Жыцьцё...
Яно, як пекла Дантавага круг,
Прыбранае ў лахмоцьце,
Поўнае бяздольля,
Бяссільля змучаных, апаўшых рук,
Галоднага,
Страшнога безрабоцьця,
Бязглуздае...
Усе сілы забівае
І мучае сваёй жахлівай зьявай.
Мора мук, стагнаньняў,
Енкаў, сьлёз —
Яго удзел...

. . . .

Ці бачыў ты,
Як лёгка едзе лімузына?
Здаваленьня знак
Ляжыць на твару,
Пры „ім" раскошным зданьнем
Цудная дзяўчына.
Прыемны пах пэрфум..
І каньяку ў губе
Яшчэ ёсьць лёгкі смак,
І плаўка ўецца сіні дым
Гаванскае цыгары...

. . . .

Ці бачыў ты,
Як паміраў работнік?
Атручаны
Страшлівым металёвым пылам,
Ен харкаў кроўю,
Дым выжраў яго вочы,
Над ўпалымі яго грудзямі
Дух сьпёрты,
Поўны вільгаці страшное сутарэны віўся.
Яго час безрабоцьця даканаў.
А там...
За грош, каб з голаду
Паволі не памерці,
Калісь прыгожая,
Чужым людзём запрадавалася дзяўчына.

. . . .

Ці бачыў ты жыцьцё?
Ці бачыў ты яго страшныя паралелі?

А. Б.

Японія ў Манчжурыі.

Японскі ўрад выслаў Лізе Нацыяў адказ Японіі на ведамую справаздачу „камісіі Ляйтона", якая з даручэньня Лігі езьдзіла ў Кітай і Манчжурыю, каб высьветліць, хто вінаваты ў вайне і як направіць адносіны між Японіяй і Кітаем. Японскі адказ кажа, што камісія наагул прадстаўляе справу небесстаронна — на шкоду Японіі; што Кітаю ня можна раўнаваць да арганізаванае дзяржавы, а таму і лічыць праўным уласьнікам „так званай кітайскай дзяржаўнай тэрыторыі"...; што кітайскі ўрад адказны за байкот японцаў і японскіх тавараў; што імкненьне Манчжурыі да незалежнасьці... ад Кітаю — зьявішча зусім натуральнае і цалком самастойнае; што прапазыцыя аддаць Манчжурыю пад мяшаны кантроль заінтэрэсаваных вялікіх дзяржаваў, замест адное Японіі, як цяпер, — „нежыцьцяздольная" і „непрактычная"... Гэтую задачу ў Манчжурыі можа выпаўніць толькі адна Японія. Іншыя вялікія дзяржавы могуць таксама ўзяць пад свой „кантроль" іншыя часткі Кітаю...

Прызнамся—ясна і адкрыта...

ХРОНІКА.

— Агульны Сход Беларускага Прафэсіянальнага Вучыцельскага Саюзу адбыўся ў нядзелю, 23 кастрычніка. Старшынстваваў на Сходзе гр. А. Луцкевіч, сэкрэтаром быў гр. Кіта.

Ад імя Ураду зрабіў справаздачу старшыня яго гр. Шнаркевіч. З апошняе высьнілася, што ў складзе Саюзу ёсьць — пасьля выключэньня „мёртвых душ" — 27 чынных сяброў, што, аднак, не абымае ўсіх вучыцялёў—беларусаў, працуючых у школьніцтве (прыкладам, беларусаў, якія выкладаюць у дзяржаўных пачаткавых школах). Дакладчык падчыркнуў неабходнасьць павясьці больш эвэргічную акцыю ў кірунку павялічэньня лічбы сяброў Саюзу.—Саюз закончыў год з касавай астачай 100 злот., пры чым не спагнаны яшчэ ўсе залегласьці ў пастаці неаплочаных сяброўскіх складак.

У дыскусіі быў пададзены рад канкрэтных прапазыцыяў у кірунку ўзмацненьня і разьвіцьця арганізацыі. Паміж іншым, аднагалосна прыняты праект дапамагчы Будаўлянаму Камітэту дому пад бурсу для вуч-

---

— Гэта мой „дозуд особісты"! — зарагатала Марціяна.—Адна такая самая пячаць стаіць у маім пашпарце.

Баравы больш не вытрываў. Выскачыў з-за стала і, зьнік за перагародкай сваёй спальні, пасьля чаго маланкай апынуўся пры выхадных дзьвярох і загарадзіў сабой дарогу. У руках трымаў паляўнічую стрэльбу, скіраваную проста ў Марціяну.

— Людцы, ратуйце! — крыкнула дзяўка, — ашалеў чалавек!

— Хочаш жыць, ці не?

— Дзядзечка, хачу! Родненькі, не забівай!

Ціснулася ў куток між сьценаў, быццам хацела ў іх праглінуць, каб толькі вырвацца. Зьбялела, як палатно. Першы раз у жыцьці сьмерць заглянула Марціяне проста ў вочы.

Баравы страшным голасам закамандаваў:

— Дык зараз-жа рабі, што табе кажу: налівай у міску карасіны і кашары свае паганыя рукі, каб цябе трасца так кашарыла!

Баравы ніколі ня меў прывычкі клясьці, але ў гэтым выпадку ўважаў, что падняты тон і кляцьба найстрашнейшымі славамі была патрэбна, каб накінуць волю сваю упорыстай служанцы.

Бачучы непераліўкі, Марціяна дрыжачымі рукамі наліла паўміскі карасіны і апусьціла ў яе рукі. Карасіна незабаўна падзмнела, а праз пару хвілін замянілася ў зусім чорную жыжку.

Прайшло каля 15 мінут, як Марціяна пачала мыць свае рукі. На лобе у яе выступіў пот і буйнымі каплямі спływаў на шчокі і там мяшаўся з сьлязьмі, вочы шустра скакалі то на рукі, то на стрэльбу, а Баравы сядзеў на парозе і ня спускаў вока з сваей ахвяры.

— Гарачае вады з мылам! — скамандаваў грубэ.

У той ж момант рукі Марціяны купаліся ў новай ваньне.

Пасьля паўгадзіннае аперацыі Марціяна не магла надзівіцца, як можна так закарэлыя рукі зрабіць белымі: цёмных лініяў на далонях і сьлед прапаў. Калі на канчатак Баравы ей трыумфальна падаў ручнік і рукі сталі сухімі, Марціяна пачула, быццам яе рукі сталі лягчэйшымі, а скура прачышчанымі порамі ўдыхае сьвежае паветра.

— Цяпер даруй, што я цябе так моцна настрашыў — адазваўся дабрадушна Баравы. —Я не вар'ят, стрэльба ня была набітэ. На, глядзі, навет пістона няма пад куркам.

———

Прайшлі два месяцы. Ні разу Бараваму ня прышлося гаварыць пры абедзе, што з рукамі ў Марціяны дрэнна. Пасьля кожнай працы сьпяшалася да ўмывальніка. Гаспадар урэшце не бяз страху заўважыў, што Марціяна пачала занадта часта сачыць за парадкам сваіх рук.

— Ці не зачаста пялешчыш рукі ў вадзе? — гаварыў часамі Баравы.


— Калі як не памыю, дзядзечка, дык чую, як нешта шчыпае скуру і рукі робіць калаватымі.

Служыла Марціяна ў Баравога ўжо трэці год. Як усё на сьвеце ня вечнае, так прышлі канцы і на ўмывальнік. Пераела яго іржа, і пачаў працякаць. Марціяна кожны дзень прыпамінала гаспадару, каб купіў у Вільні новы або стары завёз да направы, але на яе гора гаспадар то забываўся, то грошай яму не хапала, калі бываў у Вільні. Доўга так трывала Марціяна, аж урэшце заявіла ўрачыста:

— Калі ўжо дзядзька так шкадуеш грошаў на найважнейшыя гаспадарскія патрэбы, то купі ўмывальнік на мой рахунак, на рахунак маёй пэнсыі. Буду толькі дамагацца, каб, на выпадак майго ад'езду, я магла яго забраць з сабой, як сваю ўласнасьць.

Але Баравы заўсёды ей толькі прапанаваў выручацца рашкай невялікай і пастарому зазываўся прывязьці з Вільні ўмывальнік. Калі просьбы служанкі не памагалі, яна ізноў часта жалілася перад суседзямі:

— І халерачка яго ведае, гэтага майго гаспадара: прывязьці з места тытуну, гарэлкі — ніколі не забудзецца і грошы на гэта заўсёды мае, а як трэба ў гаспадарцы купіць самыя найпатрэбнейшыя рэчы, ён ня мае ні памяці, ні грошай.



няў беларускае гімназіі ў Навагрудку, каб забясьпечыць беларускім дзецям магчымасьць утрымацца за танныя грошы. Сход пастанавіў высыгнаваць пакуль-што сто злотых (значыць, усю сваю налічнасьць).

Сход даў аднагалосна абсолютюрыюм старому складу Ураду і выбраў новы. У склад новага Ураду выбраны: гр. гр. Шнаркевіч, Манкевіч, Цыбрук, Цехановскі і Орса. У склад Рэвізыйнае Камісіі—гр. гр. Сакалова-Лекант, Астроўскі і Самойла.

— Літэратурна-Мастацкая Сэкцыя. Пры Беларускім Навуковым Таварыстве арганізуецца Літэратурна-Мастацкая Сэкцыя, якая гуртуе працаўнікоў на ніве беларускае літэратуры, музыкі, малярства і г. д. Мэта Сэкцыі—збліжэньне паміж прадстаўнікамі ўсіх відаў беларускае мастацкае творчасьці і супольная праца над вывучэньнем творчасьці народнае, якая зьяўляецца падставай і нашае інтэлігенцкае творчасьці.

Пачынаньне гэтае — вельмі на часе, бо ўжо нарасло ў нас ня мала ўсіх відаў мастакоў, якія даўно адчуваюць патрэбу духовае лучнасьці. Пажадаем яму памысных вынікаў.

— Ахвяры для Беларускага Музэю ім. Ів. Луцкевіча. Апошнімі днямі атрыманы Музэем гэткія ахвяры: ад гр. Ч. Будзькі—2 кніжкі; ад гр. Савоські Андрэя — 3 манэты; ад гр. Мурашкоўскага Аляксандра—1 кніжка.

Ахвярадаўцам Дырэкцыя Музэю выказвае сваю шчырую падзяку.

— Сербіні маюць патэньнецъ. Сербікі ў Польшчы чамусьці даражэй, як на ўсім сьвеце, — блізу ў тры разы даражэйшыя, як у нас былі да вайны, ня гледзячы на значнае патаненьне патрэбных для іх фабрыкацыі матэр'ялаў. Дзеля таго Ўрад пастанавіў, як пішуць газэты, умусіць замежных арандароў гэтай дзяржаўнай манаполіі да зьмяншэньня цэнаў на сербікі. Гэта была-б важная палёгка для зьбяднеўшай вёскі.

— Новы падатак. Газэты паведамілі, быццам урад пастанавіў увесьці новы „агульны падатак“, які маюць спаганяць органы самаўраду. Быццам праект падатку будзе ўнесены ў Сойм у наступную сэсію. Новы падатак будуць плаціць усе грамадзяне, якія скончылі 21 год і самі зарабляюць на свае жыцьцё. Ад новага падатку будуць звольнены тыя, што жывуць на кошт самастойных гаспадароў і працаўнікоў, не зарабляючы самі, хто ня здольны да працы, безработныя, бедныя, эмэрыты і т. д. Разьмер падатку ад 4 да 60 зл. у год. Хто „зарабляе“ больш як 20.000 у год, будзе плаціць ад 120 зл. у год уверх.

Корэспондэнцыі.

Наш „бацюшка“.

(З Вялейскага павету).

22 кастрычніка с. г. адбылася ў Крывіцкім Гарадзкім судзе расправа над ведамым на тутэйшым грунце Аляксандрам Антановічам, яго жонкай Вольгай, Хільманам і др., абвінавачанымі сьвятарамі Іванам Спрогісам у парушэньні супакою ў царкве. Усе перакананы, што гэтая справа штучна зроблена Спрогісам — у адплату абвінавачаным за жалабу іх духоўным уладам за авантуру ў царкве, зробленую Спрогісам 15 лістапада м. г. Уся віна абвінавачаных Спрогісам асобаў у тым, што ў часе шлюбу гр. Клімовіча ў царкве памаглі дзяку сьпяваць „многія лета“ і „Отче наш“ без дазволу Спрогіса, які хацеў за гэта 5 злотых. Спрогіс, дзяк і стораж заявілі перад судом, што кананічныя правілы не дазваляюць праваслаўнаму прыхаджаніну пяяць у царкве нават „Отче наш“ без дазволу сьвятарніка. Суд пакараў Антановіча і яго жонку па 3 месяцы арышту. На судзе абвінавачаныя закідалі Спрогісу забойчыя рэчы — што ён скідаў з сябе расу і сан сьвятарніка і др. На гэта павінна зьвярнуць увагу эпархіяльная ўлада і забраць ад нас сьвятарніка, які сваімі паступкамі выклікае сярод парахвіян глыбокае абурэньне.

Прысутны на судзе.

Гаспадарчы аддзел.

Сад і гарод.

Надышла ўжо пара, калі, як у полі, гэтак у садзе і гародзе, сьпешных працаў няма, але ёсьць такія, якіх нельга занядбаць і якія абавязкова трэба выканаць увосень, бо ў працаўным разе гэта блага адаб'ецца на будучым ураджаі.

Працы ў садзе:

1) Пагодныя дні павінны быць выкарыставы для перасадкі, як дзічак, гэтак і ўшчэпаў яблынак, грушак і розных кустоў.

2) Высяваць зярняты грушаў, яблыкаў, сьліваў і вішняў. Калі-б, дзякуючы якім-небудзь прычынам, нельга было ўвосень высеяць насеньне садовых дрэваў, дык трэба гэтае насеньне перахаваць адпаведным спосабам да вясны. Найлепей перахоўваць насеньне, перамяшаўшы з вільготным зямлёю ці пяском, у гаршчкох з-пад вазонаў. Гаршчочкі трэба чым-небудзь прыкрыць, каб не змаглі пазалазіць папукі, і закапаць іх у паграбе. У гэткім стане яны павінны застацца аж да вясны.

3) Агрэст і парэчкі найлепей перасаджваць увосень. Пры гэтым трэ' памятаць, што парэчкі і агрэст добра растуць і ў маладым садзе, бо ня вельмі баяцца зацяненьня. У вільготнейшых мясцох саду садзяцца парэчкі, а ў сушэйшых—агрэст. Апрача парэчак у вільготнейшых мясцох саду можна садзіць маліну, але апошняя не павінна быць зацененай, дзеля чаго нельга садзіць яе пад дрэвамі.

Трэба памятаць, што для памыснага росту і ўраджаю агрэсту глеба павінна мець выстарчаючую колькасьць вапны.

4) У вільготную пагоду трэ' выкарыстаць час для ачышчэньня дрэваў ад моху, які ў гэты час лёгка адстае ад дрэва. Урэшце, калі паападае ўсё лісьце, дык яго трэба чысьценька зграбсьці і скласьці ў кучу, каб перагнівала. Калі-ж у садзе разьвялося шмат розных шкоднікаў, дык дзеля пасьпяховае барацьбы з імі належыць лісьце, мох, як і саскрэбленую кару спаліць, а попел пасыпаць пад дрэвамі.

5) Калі кусты маліны маюць балей пяці лет росту на адным месцы, трэба ў такім выпадку перасадзіць іх на новае месца, добра ўгноенае, пакінуўшы ў кусьце ня болей $^{1}/_{3}$ маладых (сьлетніх) сьцёблаў. Наагул кожны год увосень трэба выцінаць у кустох маліны ўсе сьцёблы, на якіх улетку былі ягады, пакідаючы толькі маладыя сьлетнія сьцёблы.

У лістападзе месяцы, калі сад зусім агаліцца ад лісьця, добра ачышчаныя дрэвы трэ' пабяліць вапнай, зьмешанай з глінай або кароўім калам і дрэўным попелам.

Трэба перакапаць пад дрэвамі зямлю і добра яе пагнаіць. Гнаіць можна ўсю плошчу саду, або толькі пад паасобнымі дрэвамі. Гнаеньне ўсяе плошчы практыкуецца пераважна пры выкарыстоўваньні плошчы саду пад пасеў якой-небудзь гаспадарчай расьліны.

Пры гнаеньні паасобных дрэваў трэба гной класьці на абводзе кароны, у якіх мясцох знаходзяцца валасковыя каранцы, а ня так, як гэта ў нас часта бывае, што гной кладзецца каля самага пня. Пры гэткім няўмелым гнаеньні ня толькі дарма марнуецца гной (зьдзеравянелыя каравi, што адыходзяць ад пня, ня маюць магчымасьці выкарыстаць гной), але яшчэ могуць пад гноем завесьціся мышы і пашкодзіць пень. Сад можна гнаіць пачынаючы з восені і аж да ліпеня месяца. Вельмі карысным ёсьць вапнаваць сад кожныя 2—3 гады. Апрача таго ў прамыслова пастаўленых садох можна выкарыстоўваць і штучныя гнаі. На 1 гэктар саду даецца ўвосень каля 200 кг. падвойнага суперфасфату і 160 кг. паташовай солі, а навясьне—200 кг. чылійскай салетры.

Працы ў гародзе.

1) Выкопваць гародніну, асушваць і закопваць у паграбе ў пясок для ўжытку зімою і на высадкі.

2) Пасьля збору гародніны гарод трэба пагнаіць і пераараць або перакапаць. На вясну нельга адкладаць ворку, асабліва на болып цяжкіх глебах. Пры ворцы гароду ёсьць адна недагоднасьць, а ўласьне: на зіму гарод трэба ўзараць, пагнаіўшы хлеўным гноем, што ня так лёгка аднача́сна зрабіць, бо-ж на зіму гарода глыбака, а гной павінен быць загараны плытка. З таго палажэньня можна выйсьці двума спосабамі. 1.—Можна загараць спачатку глыбака, на ральлі разьбіць гной і пасьля плытка ізо загараць. Пры гэтым спосабе тая нявыгода, што траціцца шмат працы—прыходзіцца два разы гараць. Другі спосаб — гараць адзін раз, аднача́сна заворваючы і гной. Дзеля таго ж, каб зямля была глыбей узварушана, за плугам пушчаецца глебапаглыбляч.

S. K.

Карысныя і цікаўныя рэчы.

Што ёсьць у сярэдзіне зямное кулі?

З чаго складаецца сярэдзіна нашае плянэты, аб гэтым горача спрачаюцца вучоныя. А гэта дзеля таго, што на практыцы—досьледам, які адзін толькі і вырашае спрачныя думкі і пагляды, не ўдалося дагэтуль сягнуць далёка ў глыбіню зямлі. Дагэтуль удалося дабрацца ў глыб зямлі шляхам сьвідраваньня не далей, як на тры кілямэтры. Як ведама, навука сягае сваім „узброеным вокам“ на шмат-мільярдавыя адлежнасьці навакол зямлі, ведаючы дакладна аб хімічным складзе сонца і найдалейшых зораў, з якіх прамень сьвятла, робячы 300.000 кілямэтраў у сэкунду, даходзіць да нашай плянэты, зямлі, праз тысячы або мільёны гадоў. Але аб глыбокіх нетрах зямлі яе гаспадар, чалавек, ведае, як бачым, вельмі мала, або, праўду кажучы, дакладна ня ведае блізу нічога.

Навука ведае, што ад паверхні зямлі да яе сярэдзіны, ці цэнтру, у сярэднім каля 6,380 кілямэтраў. Але з гэтай адлежнасьці блізу адна сотая частка прыпадае на цьвёрдую „вокладку“, ці „кару“ зямлі, на паверхні якой мы жывём. Што ёсьць глыбей — пад гэтай „карой“, няведама. Мы ведаем толькі, што, чым глыбей спускацца ў зямлю, тым гарачэй робіцца тамака, — у сярэднім на 1 градус на кожныя трыццаць тры мэтры глыбіні (па градусьніку Цэльсія). Калі такім жа чынам гарачыня расьце і далей, дык на глыбіні 100 кілямэтраў гарачыня павінна даходзіць да 3 000 градусаў, на глыбіні 200 клм. —аж да 6.000 град., г. ё. блізу такая ж тэмпература, як і сьцверджаная навукай тэмпература на паверхні сонца. Але ў такой гарачыні ня можа існаваць у цьвёрдым ці нават плынным стане ніводзін з ведамых нам хімічных элемэнтаў (простых цел). Адсюль выводзяць, што ўсё нутро зямлі павінна быць напоўнена расплаўленымі газамі.

Аднак, гэтае заключэньне можа й залішне пасьпешнае. Бо ж з узростам гарачыні павялічаецца ў глыбіні зямлі таксама і ціск, даходзячы таксама да вялізарных лічбаў. А пад уплывам гэтага вялізарнага ціску газавыя масы мусяць іхноў згушчацца ў жыжку, а мо' навет і сьціскацца ў цьвёрдыя целы. Каб хаця прыблізна разьвязаць гэтае навуковае пытаньне, нямецкі вучоны граф. Сымон рабіў лябараторныя досьледы і знайшоў, тасуючы тысячна-высокія тэмпэратуры ціску, што навет найлягчэйшы, найрадзейшы газ, гэлі, лёгка згушчаецца ў цьвёрды кавалак пад адпаведным ціскам, ня гледзячы на высокую тэмпэратуры.

Выйшаў з друку і прадаецца

у Беларускай Кнігарні У. МАНКЕВІЧА

Вільня, Вострабрамская вул. 1

Адрыўны Календар (Блёк)

на 1933 г.

Цана календара 85 гр. за экз.

Для кнігарняў і перапрадаўцоў 65 гр. за экз.

Рэдактар-выдавец: М. СІНЯЎСКІ. Друкарня Я. Левіна, Вільня, Нямецкая вул. 22